*Г.А.НЯЧАЙ*

# ХАРАВАЯ ТВОРЧАСЦЬ Э.НАСКО: ПРАБЛЕМЫ ЭСТЭТЫКІ, СТЫЛЮ, ВЫКАНАЎСТВА

На працягу двух апошніх дзесяцігоддзяў у праграмах канцэртаў харавых калектываў нашай краіны гучаць хары сучаснага беларускага кампазітара Эміля Вікенцьевіча Наско. Найбольшае прымяненне сваіх творчых сіл адораны музыкант знайшоў у сферы харавой музыкі. У гэтым напрамку ім створана вялікая колькасць твораў, розных па жанры і тэматыцы. Гэта і манументальныя харавыя сачыненні для хору, салістаў і сімфанічнага аркестра, і хары a cappella, і мноства апрацовак народных песень. Вядучыя харавыя калектывы Беларусі ўключаюць творы Э.Наско ў свой рэпертуар, запісваюць іх на радыё і тэлебачанні, выконваюць у канцэртных праграмах. Асабліва плённа працуе кампазітар з Дзяржаўным народным хорам імя Г.Цітовіча (мастацкі кіраўнік М.Дрынеўскі), Дзяржаўным акадэмічным хорам Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Беларусі (мастацкі кіраўнік В.Роўда), з хорам хлопчыкаў музычнага ліцэя пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (мастацкі кіраўнік В.Глушакоў), жаночым хорам «Менка» (мастацкі кіраўнік У.Сінельнік), мужчынскім хорам «Унія» (мастацкі кіраўнік К.Насаеў) і іншымі калектывамі. У рэпертуары студэнцкіх харавых калектываў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры таксама значнае месца належыць творам Э.Наско.

Вакальна-інструментальная і харавая музыка – найбольш значны пласт творчай спадчыны Эміля Наско. Ён звяртаецца да тэкстаў шырокага кола паэтаў: П.Броўкі, А.Куляшова, Ю.Багданава, У.Някляева, М.Багдановіча, Ж.Біраша і інш. Кампазітар імкнецца раскрыць самыя глыбокія чалавечыя пачуцці, сродкамі музыкі перадаць любоў да Радзімы, свайго народа, прыгажосць беларускай прыроды, заклікае да духоўнага адраджэння нацыі. Ён не выпадкова аддае перавагу менавіта беларускай паэзіі, бо лічыць, што беларускія паэты больш выразна перадаюць нацыянальны каларыт, рэальныя моманты з жыцця беларускага эпаса, любоў да Бацькаўшчыны.

У жанры харавой музыкі a cappella кампазітарам Э.Наско напісана таксама шмат твораў. Сярод найбольш вядомых хары «Прывет табе, жыццё на волі» (на словы М.Багдановіча), «Колыбельная река» (на словы І.Такмаковай), цыкл сачыненняў для народнага хору (на вершы беларускіх паэтаў), канцэрт «Четыре сонета о любви» (на словы Ю.Багданава), «Ратуй нас, Божа» для баса і змяшанага хору і «Духовный триптих» (на словы Т.Глазкоўскай), сюіта «Пяшчота» (на словы В.Жуковіча), а таксама вялікая колькасць апрацовак народных песень.

Каб вызначыць асноўныя рысы стылю харавога пісьма Э.Наско, разгледзім некаторыя яго хары больш падрабязна. У хары «Малітва» (1990) уздымаюцца праблемы глабальнага характару: імкненне да яднання, міру сярод людзей, заклік да духоўнага адраджэння чалавецтва. Сродкі музычнай выразнасці, якія выкарыстоўвае кампазітар у гэтым творы, адэкватныя. Мелодыка першай часткі інтанацыйна набліжаецца да рускіх знаменных песнапенняў. Такі выбар кампазітара нельга лічыць выпадковым: агульны характар верша настройвае на стрыманую, амаль аскетычную мелодыю. Вузкая па дыяпазоне, яна павольна, паступова пашырае свой аб´ём. Спалучэнне дуольнасці і трыёльнасці надае ёй цякучы, свабодны характар. Паступова мелодыя вырастае ў гарманічную вертыкаль. У сярэднім раздзеле мелодыя набывае рысы рэчытатыву, што ў спалучэнні з акордавым складам выказвання актывізуе рух. У энергічнай, гімнічнага плана тэме невялікага фугата выразна чуюцца квартава-квінтавыя інтанацыі. Частая змена тыпаў фактурнага выкладання ў хоры арганічна звязана са зместам тэксту і не стварае эфекту калейдаскапічнасці. З пункту гледжання метрарытмічнага разгортвання твор адрозніваецца свабодай, гібкасцю, следаваннем дыханню і паэтычнаму тэксту.

Цікавасць уяўляюць апрацоўкі беларускіх народных песень, створаныя Эмілем Наско для розных саставаў выканаўцаў. Аўтар беражліва ставіцца да першапачатковай тэкставай і музычнай асновы песень. Прасочым асноўныя прынцыпы апрацовак на прыкладзе некоторых з іх.

Песня «Ой, сівы конь бяжыць» – адзін з самых пранікнёных узораў любоўнай лірыкі ў беларускай народнай творчасці. Дзякуючы меладызму і тонкасці паэтычных вобразаў, гэта песня захавала актуальнасць да нашых дзён. Выкарыстанне ў тэксце такіх слоў, як «дзяўчынанька», «бледналічанька», «ручанька», «сонечка», надае асаблівую мяккасць выказванню, стварае лірычны, цёплы, задушэўны характар. Гібкі, паступовы, а таксама скачкападобны з далейшым запаўненнем рух мелодыі кампазітар падтрымаў пераменным размерам, падкрэсліваючы такім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чынам яе прыродную пластыку. Імкнучыся больш дакладна наблізіць хор да народнага выканаўства, Э.Наско захоўвае прынцып пачарговага ўступлення галасоў – пачынае бас, потым падключаецца тэнар і толькі затым уступае увесь хор. Такім жа чынам кампазітар завяршае твор – паступова выключаюцца галасы, і застаецца толькі саліст-бас на фоне хору.

Э.Наско, звяртаючыся да народных песень, вельмі ўдумліва падыходзіць да выбару складу выканаўцаў. Сярод яго апрацовак сустракаюцца творы для змяшанага саставу, аднароднага мужчынскага або жаночага хору, нярэдка аўтар падключае партыю інструментальнага суправаджэння. Напрыклад, апрацоўка «Ой, выйду ж я на вуліцу» напісана для жаночага хору, што тлумачыцца, галоўным чынам, зместам песні, яе эмацыянальнай афарбоўкай. Апавяданне ідзе ад першай асобы – галоўнай гераіні, якая, звяртаючыся да сябровак, гаворыць:

…Як пойдзеце ў чыста поле,
завіце мяне.
Як будзеце кветкі рваць,
завіце мяне.
Як будзеце вянкі віць,
завіце мяне.
Як будзеце вадой пускаць,
пусціце і мой.

Скарга дзяўчыны на сваё жыццё, ноткі няўпэўненасці і нават гультайства не выклікаюць у кампазітара спачування. Эміль Наско тонка адчуў настрой песні і іранічна падкрэсліў яго. Наогул, музычная мова твора нескладаная. Працяглы час партыя сапрана вядзе меладычную лінію, а астатнія галасы выконваюць ролю падгалоска. Асноўную тэму апрацоўкі характарызуюць пераменны размер, павольны тэмп і мелодыя ў аб΄ёме паменшанай кварты. Цікавы музычны прыём выкарыстаў кампазітар тады, калі дзяўчына просіць сябровак звіць ёй вянок, пусціць яго па вадзе: ён дае рытмічны збой, уводзячы складаны памер 5/8 на фоне размеранага руху чацвяртных і восьмых, ствараючы, такім чынам, іранічны настрой.

Вывучыўшы харавыя творы Э.Наско і дакладна прааналізаваўшы музычную мову многіх з іх, можна падкрэсліць рысы, характэрныя для стылю яго пісьма. Сродкі музычнай выразнасці, якімі карыстаецца кампазітар, складаныя і разнастайныя, музычная мова насычана прыёмамі сучаснай кампазітарскай тэхнікі. Рытмічныя сродкі музычнай выразнасці з іх канструктыўнымі, формаваральнымі і вобразна-выразнымі якасцямі з'яўляюцца галоўнымі ў творах Э.Наско. Магчымасці рытму і метра выкарыстоўваюцца вельмі вытанчана, часта сустракаюцца складаныя памеры, пераменны метр, пры гэтым нярэдка супастаўляюцца дуольныя і трыёльныя памеры. Рытм у харах Э.Наско таксама гібкі, пластычны, галасы часта раўнапраўныя і развіваюцца самастойна.

Фактура хароў кампазітара разнастайная: розныя тыпы поліфаніі прымяняюцца разам з манодыяй, гамафонна-гарманічным і акордавым складам выказвання. Гармонія таксама складаная, насычаная рознымі дысаніруючымі сугуччамі, энгарманічнымі абаротамі, эліпсісамі. Часта сустракаюцца акорды квартава-квінтавай структуры. Мелодыка хароў Э.Наско шматвобразная: часам яна песенная, распеўная, а іншы раз у ёй чуецца ўпэўненая дэкламацыя. У поліфанічных творах кампазітар нярэдка карыстаецца тэмай-«зернем» – інтанацыйна яскрава акрэсленай, закончана выказанай музычнай думкай.

Сёння Эміль Наско працягвае працаваць у жанры вакальна-харавой музыкі і стварае творы для розных саставаў выканаўцаў. Яго харавая творчасць адлюстроўвае вялікі спектр пытанняў і тэм, якія хвалююць аўтара. З мастацкага пункту гледжання харавыя творы кампазітара выкананы на высокім прафесійным узроўні, адрозніваюцца глыбінёй праннікнення ў першакрыніцу, яскравай вобразнасцю і выразнасцю музычных сродкаў. Наогул, харавая творчасць Э.Наско, безумоўна, заслугоўвае ўвагі музыкантаў-выканаўцаў і можа шырока выкарыстоўвацца ў педагагічнай практыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ